МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС
ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСІ

Паважанае спадарства,

шчыра дзякуем усім за ўдзел у Міжнародным Кангрэсе даследчыкаў Беларусі. Спадзяемся, што Ваша знаходжанне ў Коўна было плённым і цікавым.

Арганізацыйны камітэт паведамляе пра магчымасць надрукаваць тэзісы выступаў у спецыяльным зборніку. Вы маеце магчымасць да 25 лістапада дапрацаваць тэксты (патрабаванні гл. ніжэй) і даслаць іх на адрас: icbs@palityka.org.

Калі тэзісы, якія вы падавалі перад Кангрэсам, не патрабуюць дапрацоўкі, усё адно маем просьбу прагледзець іх уважліва, дадаць неабходную інфармацыю і ў абноўленым выглядзе падаць для выдання зборніка.

1. Памер: 5-8 тысяч друкаваных знакаў
2. Мова: беларуская, ангельская, польская, літоўская, руская.
3. Перад тэзісамі трэба дадаць анатацыю (на мове арыгіналу і па-ангельску, не больш за 500 знакаў кожная) і ключавыя словы (каля 5 ключавых словаў на мове арыгіналу і па-ангельску).
4. Напрыканцы тэксту неабходна пазначыць (на мове арыгіналу і па-ангельску): а) імя, b) навуковую ступень, c) інстытуцыю.
5. Файлавы фармат: .doc, .rtf (просьба без значнай неабходнасці файлы не архіваваць).

Для тых, хто мае жаданне надрукаваць уласныя матэрыялы ў выглядзе навуковага артыкула (35-55 тыс. друкаваных знакаў), ёсць магчымасць падаць тэксты ў часопіс “Палітычная сфера” (http://journal.palityka.org/). Выданне прысутнічае ў шэрагу міжнародных навуковых бібліятэк, у прыватнасці Central and Eastern European On-line Library, а таксама рэферыруецца ў International Political Science Association (IPSA) Abstracts.

Да друку прымаюцца матэрыялы на беларускай, рускай, англійскай, а таксама польскай і ўкраінскай мовах. Электронны адрас: info@palityka.org ці icbs@palitka.org (з пазнакай “артыкул для “Палітычнай сферы”).

Маем гонар паведаміць, што наступны Кангрэс адбудзецца 28-30 верасня 2012 года (Коўна, Літва).
Тэрмін падачы заявак для ўдзелу ў наступным Кангрэсе – 5 чэрвеня 2012 года.
Да 5 сакавіка можна падаваць заяўкі на арганізацыю тэматычных і спецыялізаваных панэляў і секцый. Для гэтага неабходна даслаць 1) прыблізную назву панэлі/секцыі; 2) кароткую канцэпцыю (не больш за 500 слоў); 3) прыблізны склад удзельнікаў.

Будзем ўдзячны за любыя іншыя ідэі, праекты і прапановы па супрацоўніцтву.

З павагай,

Арганізацыйны камітэт Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі